В. М. САКАЛОВА

# ПАЛАЦ ЯК СЕМІЯТЫЧНЫ КАМПАНЕНТ МАГНАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ (на прыкладзе маёнткаў Тышкевічаў) / RŪMAI KAIP SEMIOTINĖ KOMPONENTAS MAGNATAS KULTŪRA (dėl pavyzdys Tiškievičių turtas)

V. SAKALOVA

# PALACE AS A SEMIOTIC COMPONENT OF MAGNATE CULTURE (on the example of Tyshkevichs' estates)

*The article deals with the palace as a semiotic component of magnate culture as an object of cultural semantics in the context of the Tyshkevichs' genus. Polyfunctionality of palace is described as a carrier and translator of important information about cultural values, norms, rules and traditions of the era.*

Значную ролю ў фарміраванні пэўнай мясцовасці адыгрывае палац – адзін з найбольш важных свецкіх будынкаў. Палац фарміруе, інтэнсіўна асвойвае прастору, ствараючы своеасаблівы гісторыка-архітэктурны ансамбль, багаты памятнымі падзеямі і фактамі. Гэта месца, вакол якога складваецца культурнае асяроддзе горада ці мястэчка. Месца, напоўненае сэнсам: у ім духоўна ўвасоблены і яго насельнікі, і яго стваральнікі. З пазіцый культурна-семіятычнага падыходу палац – важнейшы топас культурнай прасторы, месца лакалізацыі, перасячэння гісторыі дзяржавы і гісторыі паўсядзённасці. Культурныя аб'екты разглядаюцца ў культурнай семантыцы як сродкі трансляцыі культурна значнай інфармацыі, і палац як такі аб'ект транслюе інфармацыю аб культурных каштоўнасцях, нормах, правілах, традыцыях пэўнай эпохі.

Палацы займаюць важнае месца ў культуры маёнткаў. Спачатку гэта былі замкавыя пабудовы, якія выконвалі абарончыя функцыі. На дзядзінцы замкаў размяшчаліся драўляныя палацы, на месцы якіх у XVIII ст. узнікаюць палацава-паркавыя ансамблі еўрапейскага тыпу.

Палац з'яўляўся сімвалам улады, раскошы, прыкметай прыналежнасці да вышэйшага саслоўя, але ў кантэксце беларускай магнацкай культуры XIX – першай паловы XX ст. ён яшчэ ў вельмі значнай ступені – цэнтр культуры і мастацтва. Архівы, мастацкія, этнаграфічныя, нумізматычныя зборы сталі абавязковай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыналежнасцю палацаў. Каштоўнасці матэрыяльнай і духоўнай культуры лакалізоўваліся ў палацы і пераўтваралі яго ў грамадска каштоўную скарбніцу. Так, палац Тышкевічаў у Чырвоным Двары захоўваў адну з самых багатых бібліятэк у Літве і Беларусі, вялікую мастацкую галерэю з работамі Караваджа, Рубенса, Мацейкі. У палацах многіх магнацкіх родаў пануе дух мастацтва, асветы. У замкавым палацы Францішка Агіньскага (Маладзечна) былі тэатр, карцінная галерэя, астранамічны і матэматычны кабінет, прылады якога кампазітар Міхал Клеафас Агіньскі разам з бібліятэкай перадаў Віленскаму ўніверсітэту [11, с. 19]. Маёнтак Залессе (каля Смаргоні) магнацкага роду Агіньскіх сучаснікі называлі «Паўночнымі Афінамі». У пачатку XIX ст. у палацы М. К. Агіньскага збіраліся выбітныя дзеячы той эпохі: музыканты, мастакі, паэты, вучоныя з Пецярбурга, Масквы, Варшавы, Парыжа. М. К. Агіньскі займаўся мецэнацтвам, дабрачыннай і асветніцкай дзейнасцю. Адкрыў у Маладзечна школу, у якую перадаў часткова сваю бібліятэку і калекцыю музычных інструментаў, пабудаваў у Вільні дом для беднаты [7, с. 85].

Многія палацы, асабліва ў Беларусі, былі знішчаны, і аб былой велічы нагадваюць толькі руіны, рэшткі паркаў і малюнкі Напалеона Орды. Але тое, што захавалася, патрабуе аднаўлення, не толькі фізічнага, а ў культурнай, гістарычнай памяці, і дасканалага вывучэння. Важнасць пастаўленай мэты абумоўлена таксама недакладнасцю і супярэчлівасцю звестак у навуковай і калянавуковай літаратуры пра гісторыю палацаў і лёс іх уладальнікаў.

Буйныя землеўладальнікі магнаты Тышкевічы ўзводзілі палацы на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Украіны. Захаваліся іх гарадскія рэзідэнцыі ў Варшаве, Кракаве, Вільні. Загарадныя палацы большай часткай у класічным стылі знаходзіліся ў Лагойску, Валожыне, Вялым, Астрашыцкім Гарадку, Свіслачы, Паланзе, Лентварысе, Троках (Ужутракіс), Чырвоным Двары (Раўдандварыс), Біржах.

Свецкі будынак палаца знакавы ў семіятычнай сістэме мясцовасці. Палацавы комплекс у Лагойску паўплываў на развіццё і росквіт былога мястэчка, спрыяў пераўтварэнню яго ў горад. Фарміруючы і развіваючы культурнае і сацыяльна-эканамічнае жыццё Лагойска, Тышкевічы будуюць дзве ўніяцкія і дзве праваслаўныя царквы, фабрыкі льняных і бавоўнавых вырабаў, шкляны завод, ліцейную фабрыку, крэдытны банк, прадпрыемства па вырабу цукру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Палац Тышкевічаў у Лагойску.
Акварэльны малюнак Напалеона Орды

Тышкевічы ўклалі вялікія сродкі ў развіццё марскога курорта Паланга, які належаў ім з 1824 г.: на пляжы ўладкавалі кабінкі для купання, пабудавалі прыстань з доўгім пірсам, гасцініцу, тэатр, прагімназію, у суседнім мястэчку адкрылі школу мараходства. Палангу набыў граф Міхал Тышкевіч (1761–1839), які ў 1812 г. сфарміраваў і ўзначаліў у Вільні 17-ы літоўскі уланскі полк, названы «уланамі графа Тышкевіча».

Палац Тышкевічаў у Лентварысе, недалёка ад Вільні і Тракая, пабудаваны ў другой палове XIX ст. Юзафам Тышкевічам і перабудаваны яго сынам Уладзіславам у стылі англійскай неаготыкі, не проста радавы маёнтак, а месца адпачынку для гасцей і мясцовых жыхароў. (У палацы да Першай сусветнай вайны размяшчалася багатая калекцыя жывапісу.) Рэзідэнцыя з трох бакоў акружана водамі штучнага лентварыскага возера. Насупраць палаца на беразе возера і сёння стаіць цудоўны будынак былога летняга кафэ «Рыўера», які арганічна ўпісваецца ў адзіны ансамбль з усімі будынкамі палацава-паркавага комплексу. Порцікі кафэ трымаюць на плячах атланты, такія ж фігуры і на цэнтральным уваходзе ў Вільнюскі тэхнічны ўніверсітэт, таксама былы палац Тышкевічаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Палац Тышкевічаў у Лентварысе.
Малюнак Напалеона Орды (1875–1877)

З пазіцый культуралогіі архітэктура – сістэма каштоўнасных арыентацый, сэнсавых уяўленняў, увасобленых у формах мастацтва. Палац – топас культурнай прасторы, сэнс якога не вычэрпваецца рамкамі мастацкай сферы, гэта музей, тэатр, бібліятэка, архіў. З палацам звязана калекцыяніраванне прадметаў мастацтва, музейных рэдкасцей, кніг, раслін, што азначае пачатак музейнай справы. Гэта прыкметная з'ява для ўладальніка палацава-паркавага ансамбля.

Так, лагойскі палац, узведзены ў 1814–1819 гг. маршалкам шляхты Барысаўскага павета Піем Тышкевічам, становіцца цэнтрам дзейнасці яго сыноў Канстанціна і Яўстаха, гістарычная і культурная спадчына якіх упрыгожвае сёння залы многіх музеяў свету. Палац у Лагойску ператвараецца ў першы публічны музей старажытнасцей, выконвае адукацыйную, асветніцкую і папулярызатарскую функцыі. З лагойскім палацам звязана развіццё ў Беларусі археалогіі, этнаграфіі, краязнаўства, музеязнаўства і фальклярыстыкі. Нумізматычная калекцыя, геаграфічныя карты, мастацкая галерэя, унікальныя мастацкія вырабы: скульптуры, гравюры, зброя – паказчык добрага густу, вынік высокай адукацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іх уладальнікаў. Каля 20 тыс. кніг сабраны ў бібліятэцы палаца, сярод якіх каля 500 старажытных помнікаў кнігадрукавання, рукапісы. Архівы Тышкевічаў знаходзіліся ў Лагойску, два ў Вільні, адзін у Біржах, адзін у Чырвоным Двары (Раўдандварыс) і інш. [12, с. 15]. Напрыклад, лагойскі архіў К. Тышкевіча (захоўваецца ў Галоўным архіве старажытных актаў Варшавы), па сведчанні Язэпа Янушкевіча, калі дакументы скласці адзін на адзін, будзе таўшчынёй 5 метраў; ён змяшчае важныя матэрыялы не толькі з сямейнай гісторыі, але і пра мінулае Беларусі і Літвы [12, с. 14].

Па дарозе на Лагойск, на беразе рэчкі Усяжы ў Астрашыцкім Гарадку, які па дакументах 1650 г. тады называўся «Гарадок пана Тышкевіча», некалі на дзядзінцы замка размяшчаўся драўляны палац, на месцы якога ў XVIII ст. з’явілася палацава-паркавая рэзідэнцыя Тышкевічаў. Умяшчальня культурных каштоўнасцей і артэфактаў, мураваны палац быў пабудаваны ў 1885 г. Міхалам Тышкевічам (1828–1897), які размясціў у ім нумізматычныя зборы, калекцыі ювелірных вырабаў, карцін французскай і фламандскай школ жывапісу, археалагічныя знаходкі [3], калекцыі вайсковых даспехаў XVI–XVII стст., старажытнага фаянсу, фарфору і шкла [5].

Вядомы знаўца каштоўных камянёў Джордж Кунц прыводзіць цікавы факт, які пашырае веды пра калекцыйныя захапленні Тышкевічаў. Адзін з самых рэдкіх і значных асобнікаў калекцыі Моргана – Ціфані – старадаўняя вавілонская сякера з паласатага агату (2000 г. да н. э.) першапачаткова належала кардыналу Стэфану Борджыа. З сям’і кардынала яна была прададзена за 3000 долараў у калекцыю Тышкевіча, а калі прадметы з гэтай калекцыі былі выстаўлены на публічныя таргі, Дж. Кунц у 1902 г. набыў яе для Амерыканскага музея прыродазнаўчай гісторыі ў Нью-Ёрку [6, с. 73].

Палацы ўзводзіліся пакаленнямі і захоўвалі традыцыі. Пераемнасць пакаленняў утварала духоўны свет палаца. Галерэі фамільных родаў – абавязковая прыналежнасць амаль усіх магнацкіх палацаў. Павага да гістарычнага мінулага – важны складнік стану грамадства. Так, у Троках, летняй рэзідэнцыі графа Юзафа Тышкевіча (1868–1917), уздоўж галоўнай Княжай алеі, што вяла ад берага возера да палаца, стаялі мармуровыя бюсты вялікіх літоўскіх князёў. У савецкія часы, калі палац стаў санаторыем КДБ, бюсты былі знішчаны. Існуе паданне, што ўказанне разбіць бюсты і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

закапаць у зямлю выканалі, але бюст Альгерда разбіць не паднялася рука, і яго ўтапілі ў возеры.

У семіясферы культурнай прасторы належнае месца займае і пейзаж.

Палацава-паркавыя ансамблі XIX ст. уключалі англійскі парк, звярынец (абавязковы элемент вялікіх палацава-паркавых комплексаў), аранжарэі з экзатычнымі раслінамі і нават батанічны сад. Так, спецыфікай пабудовы прасторы палацава-паркавага ансамбля маёнтка Агіньскіх Залессе былі два палацы, два паркі, дзве аранжарэі, у адной з якіх было сабрана каля 300 раслін, два звярынцы [7, с. 84].

Паркі падкрэслівалі прыгажосць прыроды, характэрны натуральны пейзаж. Завершанасць ансамблю надавалі рака ці возера, вадаём. З вялікай увагай адносіліся да разнастайнасці раслін і дрэваў.

Англійскі парк уздоўж ракі Гайна, што займаў плошчу 16 га, неад’емны элемент цэласнага архітэктурнага ансамбля лагойскага палаца. Цудоўныя англійскія паркі, якія захаваліся да нашых дзён, у маёнтках Тышкевічаў у Лентварысе, Паланзе, Троках, Тракy Воке праектаваў знакаміты французскі ландшафтны архітэктар і батанік Э.-Ф. Андрэ.

З Тышкевічамі звязана ўзвядзенне палацавага ансамбля ў Валожыне (захаваўся да нашых дзён). Маёнтак Юзафу Тышкевічу прадаў за сто тысяч злотых вядомы палітычны дзеяч Адам Чартарыйскі. У 1803–1806 гг. Ю. Тышкевіч пабудаваў у класіцыстычным стылі палац, афіцыну, а ў 1806–1815 гг. касцёл Св. Юзафа са званіцай. Затым маёнткам валодаў яго сын Міхал, а пасля ўнук Ян Тышкевіч, заснавальнік маёнтка ў Біржах. Пастyпова каля палаца разбіваюцца пейзажны парк, сад, будуецца аранжарэя са сферычным купалам. Тут раслі апельсінавыя дрэвы, пальмы, трапічныя расліны, вырошчваліся ананасы. Ад экспарту пладоў мелі вялікі прыбытак. У залах палаца размяшчаліся карціны і партрэты, была хатняя капліца і пакой-скарбніца. Калекцыяніраваннем карцін займаўся Ян Тышкевіч. Даследчык беларускіх маёнткаў А. Т. Федарук адзначае, што ў адным з лістоў (1864) К. Тышкевіч з Лагойска прапаноўваў Яну набыць калекцыю карцін князя М. К. Агіньскага [11, с. 159–160].

Маёнтак Тышкевічаў у Свіслачы ўключаў палац, аранжарэю, парк плошчай 10 га. На сродкі графа Вінцэнта Тышкевіча ў 1805 г. у Свіслачы пабудавана гімназія. Гасцямі маёнтка былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучні гімназіі – будучыя пісьменнік і гісторык Ю. Крашэўскі, мастак і кампазітар Н. Орда, літаратары Ю. Нямцэвіч, Ф. Карпінскі і інш. [7, с. 86].

Архітэктурная прастора палаца жыве дваістым жыццём. Яна мадэлюе ўніверсум: структура пабудаванага і абжытага свету пераносіцца цалкам на ўвесь свет, мадэлюецца ўніверсумам: свет, які стварае чалавек, рэпрадуктуе яго ўяўленні пра глабальную структуру свету [8]. З гэтым звязаны высокі сімвалізм усяго, што датычыцца ствараемай чалавекам прасторы яго жылля.

Дом – прастора, унутры якой адбываецца працэс семіятычнага сэнсаўтварэння, складаецца семіятычная сістэма, якая генерыруе сэнс. Культуролагі лічаць, што дом – асноўны вобраз, архетып, значны для чалавека. Для магнацкіх родаў домам быў палац. Палац-дом адзначаецца высокай семіятычнасцю. У ім адбываецца інтэлектуальнае і маральнае станаўленне і развіццё асобы. Палацавая прастора, адухоўленая яе насельнікамі, жыве ў памяці многіх пакаленняў, фарміруе іх характары.

Паглыблены ў культурную прастору чалавек непазбежна стварае вакол сябе арганізаванае прасторавае асяроддзе, якое ўключае ідэйныя ўяўленні, семіятычныя мадэлі, культурную дзейнасць.

Палац набывае характар сімвала, адыгрывае сімвалічную функцыю, сімвалізуе супольнасць сям'і (прастора паўсядзённасці), агульнасць веры (сакральная прастора), грамадзянскую агульнасць (прастора палітычная) [8].

Неабходна адзначыць асаблівасці духоўнага асяроддзя магнацкіх сем'яў, прасякнутага пачуццём патрыятызму і рамантычнай узнёсласці. Характэрнай рысай рамантызму была цікавасць да народных звычаяў, песень, паданняў, якія з'яўляліся крыніцай натхнення ўладальнікаў палацаў. Узвышанасць пачуццяў характарызуе насельнікаў палацаў. Яны былі адукаванымі, прагрэсіўна настроенымі людзьмі, якія за мэту жыцця ставілі аддана служэнне грамадству. Атмасфера палаца, зрабіўшы вялікі ўплыў на духоўны свет бацькоў, потым падтрымлівалася ў дамах іх дзяцей.

На працягу стагоддзяў палац абрастае міфамі, становіцца міфалагічным месцам, з якім звязаны пэўныя легенды і паданні, успаміны як неад'емная частка культурнай памяці. Незвычайны лёс, моцныя і разам з тым рамантычныя характары прадстаўнікоў роду можна праілюстраваць некаторымі прыкладамі. Яскравыя прыклады творчай, таленавітай, дзейнай натуры, акрамя шырока

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вядомых сёння ў Беларусі братоў Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў, – Бенядзікт Генрык і Бенядзікт Ян Тышкевічы, кінаактрыса Беата Тышкевіч.



На Літоўскай вуліцы Варшавы ў бацькоў Кшыштафа Марыі Тышкевіча (1911–1977) (бацькі кінаактрысы Беаты Тышкевіч) Ірэны і Юзафа Тышкевічаў быў невялікі, але раскошны палац. Захаваўся да нашых дзён, зараз у ім размяшчаецца амбасада Славакіі. (У Варшаве знаходзіцца і адзін з найбольш важных палацаў у неакласічным стылі ў горадзе – палац, што быў пабудаваны ў XVIII ст. для гетмана польнага, падскарбія вялікага і маршалка вялікага літоўскага Людвіка Скумін-Тышкевіча, які ажаніўся з Канстанцыяй Панятоўскай, пляменніцай караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Сёння ў палацы месціцца музей Варшаўскага ўніверсітэта.)

Палац на Літоўскай вуліцы, па ўспамінах Б. Тышкевіч, успрымаўся маленькай дзяўчынкай як існы рай [10]. І хаця гэта былі гады нямецкай акупацыі, гэта былі шчаслівыя гады яе маленства. Успаміны пра святкаванне Раства за вялікім доўгім сталом, аздобленым люстэркавай кафляй, у якой адбіваўся бляск пазалочаных талерак. Да Пасхі заўсёды пяклі мазуркі з пясочнага цеста, якія ўпрыгожвалі гронкамі зацукраванай парэчкі, абавязкова белай і чырвонай – у нацыянальных колерах. З парэчак вымалі зярняткі. Беата Тышкевіч падкрэслівае, што атрымала ў спадчыну і саму гэтую традыцыю, і няўхільнасць яе выканання. Традыцыйна гатавалі разнастайныя прысмакі: лясныя фіялкі і ажыну ў цукры, шакаладкі, зробленыя хатнім спосабам, калі шакаладная маса разлівалася ў шкарлупіны грэцкага арэха.

Няўхільным сямейным этыкетам было правіла пісаць з вялікай літары словы «Тата», «Матуля», «Бацька», «Маці». Да продкаў адносіліся з вялікай павагай. Захоўваліся партрэты дынастыі, вялася сямейная хроніка.

Заможныя арыстакраты Тышкевічы атрымалі ў спадчыну шмат нерухомасці і капіталу. Паміж рамамі высокіх вокнаў сталовай палаца на Літоўскай вуліцы ляжалі рулоны грошай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Ірэна Тышкевіч сябравала з папскім нунцыем у Польшчы, будучым папай Піем XI. У палацы вісеў яго фотаздымак з дароўным надпісам, які, падчас акупацыі ахоўваў палац. Вокны хатняй капліцы выходзілі ў двор будынка гестапа. Калі ўвесь квартал Літоўскай вуліцы быў заняты немцамі, палац бабкі і дзеда Беаты Тышкевіч пакуль заставаўся выключэннем. Ірэна і Юзаф Тышкевічы, як узгадвае Беата Тышкевіч, былі людзьмі XIX ст. па укладзе жыцця, правілах і прывычках, якія не звярталі ўвагі на рэальнасць, таму што былі пазбаўлены інстынкту самазахавання.

Немцам быў патрэбны палац Тышкевічаў. Калі генерал гестапа ўпершыню прыйшоў у палац, то быў у захапленні ад багатага ўбранства пакояў. Ірэна Тышкевіч прымала яго ў збраёўні, дзе красавалася багата аздобленае аксамітавае сядло Стэфана Чарнецкага, вышыванае золатам, з нефрытавымі кулонамі, інкруставанымі золатам, упрыгожанае каштоўнымі камянямі. Побач размяшчаліся ружжо Стэфана Баторыя, прыклад якога інкруставаны слановай косцю (падарунак Міхала Радзівіла), гусарскі рыштунак Любамірскага, а на сцяне – габелен 1685 г.

Генерал прапанаваў прадаць палац немцам, на што графіня коратка заўважыла, што продаж дома не ўваходзіць у планы сям'і.

Генерал прыходзіў і ў другі раз, а трэці «візіт» у жніўні 1944 г. быў трагічным. Усіх мужчын, у тым ліку Юзафа Тышкевіча, расстралялі. Бібліятэка, якая налічвала 25 тыс. асобнікаў, мэбля, каштоўныя калекцыі – усё захапілі немцы. Граф паспеў перадаць маці Беаты інкруставаны золатам кулон, зняты з сядла Чарнецкага, сказаўшы, што кулон будзе сведчыць пра знаходжанне гістарычнага сядла ў валоданні Тышкевічаў. Кулон як сямейную рэліквію захоўвае Беата Тышкевіч.

Жанчын немцы адпусцілі, далі на зборы пяць хвілін. Ірэна Тышкевіч сабрала ўсіх у капліцы на прычасце, з сабой узяла рэліквію Святога Крыжа (дзве маленькія трэскі) і посуд з аплаткамі – адзінае, што склала пасля вызвалення яе пасаг. Нават у спешных зборах Ірэна адшукала і надзела пальчаткі. Калі 1 жніўня 1944 г. пачалося Варшаўскае паўстанне супраць нямецкіх захопнікаў, бацька Беаты, Кшыштаф Тышкевіч, адважна ваяваў (узнагароджаны Кавалерскім Крыжам ордэна Virtuti Militari), быў заўсёды апрануты, як для параднага візіту: у касцюме з англійскай фланелі і замшавых пальчатках колеру ласося. У пальчатках капаў бульбу, знаходзячыся ў зняволенні, граф Бенядзікт Ян Тышкевіч, чаму вельмі дзівіліся жыхары Валожына.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беата Тышкевіч успамінае стрыечнага брата бацькі прыгажуна Бенядзікта Тышкевіча, знакамітага музейшчыка, якога ўсе звалі Бісем; як і бацька Беаты, ён валодаў антыкварнай крамай у Варшаве. У тыя часы па вуліцах Варшавы замест таксі курсіравалі рыкшы – роварныя рамізнікі. У Біся быў свой рыкша, на яго калясцы красаваўся герб Тышкевічаў з графскай каронай, упрыгожанай пёрамі страуса. У 2002 г. на блышыным рынку Беата Тышкевіч выпадкова купіла срэбраны венскі партабак Бенядзікта Тышкевіча з надпісам: «I приз за победу в забегах рикш в Варшаве 25 июля 1941 г.» . Сёння цяжка ўявіць, што ў часы акупацыі праходзілі спаборніцтвы рыкш. Яшчэ адно пацверджанне жыцця ў іншай рэальнасці.

Праз шмат гадоў Беата Тышкевіч купіла сядзібу ў мясцовасці Ляскава-Глухах, некалі маёнтак Цыпрыяна Норвіда, з паркам, у якім раслі дрэвы з XVII ст. Па тагачасных законах дазвалялася прадаваць такія землі, што фармальна лічыліся сельскагаспадарчымі ўгоддзямі, толькі асобам, якія мелі пасведчанне аб аграрнай кваліфікацыі. Маці актрысы як выпускніца сельскагаспадарчага факультэта Ягелонскага ўніверсітэта мела ўсе неабходныя дакументы [10].

Атмасфера роднага дома аказвае вялікі ўплыў на фарміраванне характару і таленту многіх пакаленняў. У родзе Тышкевічаў было шмат таленавітых людзей, што тлумачылася таксама і той атмасферай, якая панавала ў палацы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобы неардынарныя, цікавыя бацька і сын – Бенядзікт Генрык і Бенядзікт Ян Тышкевічы.



Бенядзікта Генрыка Тышкевіча (1852–1935) называюць адным з яскравых і таленавітых наватараў у фатаграфіі канца XIX – першай паловы XX ст. Фатаграфічнае мастацтва графа было высока ацэнена на Міжнароднай выстаўцы мастацтваў, прамысловых вырабаў і прадуктаў глеб і шахт (International Exhibition of Arts, Manufactures and Products of the Soiland Mine) у Філадэльфіі, што адбылася з нагоды прыняцця Дэкларацыі незалежнасці ЗША ў 1876 г. і дзе былі прадэманстраваны дасягненні, сярод якіх – гіганцкая паходня ў руцэ яшчэ незавершанай статуі Свабоды, тэлефон Аляксандра Бэла, тэлеграф Томаса Эдзісана, машынка для друкавання «Рэмінгтан», а ў галерэі сусветнай фатаграфіі – лепшыя фотаздымкі Б. Г. Тышкевіча, за якія 24-гадовы граф быў узнагароджаны медалём.

Сярод захапленняў графа – вандроўкі па экзатычных землях Індыі, Кітая, Японіі, Афрыкі, для чаго ён арандаваў караблі. У дарожных нарысах, лістах з Афрыкі Генрыка Сянкевіча згадваецца Тышкевіч, які вандраваў разам з пісьменнікам у 1891 г. Г. Сянкевіч узгадвае выпадак з кракадзілам на рацэ Кінгані, які амаль што перавярнуў іх лодку падчас палявання [9, с. 236].

Бенядзікт Генрык Тышкевіч пабудаваў уласную яхту «Жамойція», на якой здзейсніў вандроўку вакол свету. У часопісе «Wędrowiec» («Вандроўнік») у 1875 г. пісалі, што ён вярнуўся «из дальнего путешествия, во время которого побывал в самых отдаленных странах Востока, откуда привез с собою немало

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

научных трофеев», і што «граф Тышкевич собирается теперь в Святую землю, в Китай, Японию и Австралию». Пра намер Тышкевіча здзейсніць кругасветнае падарожжа на яхце гаварылася таксама на пасяджэнні Парыжскага геаграфічнага таварыства ў 1878 г. З гэтай мэтай ён прыступіў да пабудовы ў Гаўры парусанай яхты грузападымальнасцю 320 бочак. Экіпаж яхты складаўся з 37 чалавек [1].

Граф не толькі вандраваў сам, але і падтрымліваў аматараў падарожжаў. Так, ён аказваў матэрыяльную і арганізацыйную дапамогу падчас першай польскай навуковай экспедыцыі на марской яхце вядомаму польскаму падарожніку і яхтсмену С. Ш. Рагазіньскаму, які ў знак удзячнасці назваў імем Тышкевіча возера Мбу ў Камеруне.

На некаторы час Б. Г. Тышкевіч пасяліўся на партугальскай выспе Мадэйра ў Атлантычным акіяне, дзе размясціў абсерваторыю і ў тэлескоп назіраў за акіянам. Як пісаў С. Ш. Рагазіньскі: «Ни одно судно, заходящее в порт, не остается незамеченным зорким телескопом графа. Тышкевич живо интересуется всем, что связано с путешествиями и морем, и поэтому превратил красивый павильон на береговой скале парка в маленькую морскую обсерваторию. Ее узнаешь уже издалека по высокой мачте с развевающимся на ней флагом морского яхт-клуба. На этой маленькой морской станции есть все необходимое. Еще недавно перед нею покачивалась на волнах в порту прекрасная яхта графа, похожая скорее на образцовый военный корабль, чем на частную яхту» [1].



Паляваў Бенядзікт Тышкевіч у Налібоцкай пушчы (сядзіба Вялае на Іслачы, цяпер Валожынскі раён, – летняя рэзідэнцыя графа). На Валожыншчыне Тышкевічы валодалі землямі, якія займалі больш як 40 тыс. га. У Вялым знаходзіўся палац паляўнічых, узведзены ў 1883 г. па швейцарскім праекце. Апісанне палявання ў пушчы цікава перададзена ў апавяданні Р. Маркава «Волчий князь. Рассказ старого егеря», надрукаваным у

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

1896 г. у часопісе «Нива» [2]. У графа Тышкевіча ў Валожыне быў завод англійскіх верхавых коней, а ў двухпавярховай канюшні ў Вялым стаялі арабскія коні, быў тут і гараж для аўтамабіляў.

Па сведчанні мясцовых жыхароў, палацаў было два. Адзін з палацаў быў прыстасаваны для заняткаў фатаграфіяй, граф Б. Г. Тышкевіч абсталяваў у ім фоталабараторыю, фотапавільён, таксама размясціў прыродазнаўчую калекцыю, калекцыю карцін і фотаздымкаў. Да сённяшняга часу захаваліся руіны палаца, у якім размяшчалася фоталабараторыя графа. Другі палац не захаваўся. Палацы размяшчаліся ў пейзажным англійскім парку, які пераходзіў у лясны масіў, што служыў звярынцам плошчай 500 га.

У Вялым у 1890-х гг. Б. Г. Тышкевіч зрабіў шмат фотазамалёвак паўсядзённага жыцця.

Альбом знойдзеных у канцы XX ст. у парыжскага антыквара 86 фотаздымкаў графа (надрукаваны ў Вільні ў 2002 г.) дэманструе сцэны вясковага жыцця, побыту сялян у Вялым, прадметы сялянскага быту, адзенне.

Унікальныя фотаздымкі сядзібы графа ў Вялым знаходзяцца ў музеі, створаным у Пяршайскай сярэдняй школе – мястэчка Пяршаі (Валожынскі раён), таксама належала Тышкевічам, – яны яшчэ не ўведзены ў навуковы ўжытак. У перадачы, падрыхтаванай Белтэлерадыёкампаніяй у 2011 г. «Лабірынты гісторыі беларускага фотамастацтва» (частка 3), упершыню дэманструюцца фотаздымкі аднаго з палацаў графа Бенядзікта Генрыка Тышкевіча ў Вялым (1930-х гг.).

У Пяршаях у мясцовых жыхароў – сям’і Бярнацкіх – захоўваюцца два альбомы (каля 100 фотаздымкаў) з фатаграфіямі апошняга гаспадара Вялава – Бенядзікта Яна (1875–1948), старэйшага сына Бенядзікта Генрыка, які пераняў цягу бацькі да вандровак па экзатычных краінах і захапленне мастацтвам фатаграфавання. На здымках і 80-гадовы граф у апошнія гады жыцця на віле Menton (Лазурны бераг Францыі), і моманты з жыцця самога Бенядзікта Яна. Захаваліся яго фотаздымкі афрыканскіх плямён і палявання (з паляўнічымі трафеямі, напрыклад афрыканскім насарогам). Гэтыя фотаздымкі таксама яшчэ чакаюць аналізу і атрыбуцыі навукоўцаў.

Бенядзікт Ян Тышкевіч разбудаваў сядзібу ў Вялым, стварыў вялікі запаведнік, дзе разводзіліся бабры, алені і прывезеная з Аўстрыі лань.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Калі ў 1939 г. чырвонаармейцы прыйшлі арыштоўваць графа, яны канфіскоўвалі маёмасць і выкідвалі рэчы праз вокны палаца. Іван Антонавіч Бярнацкі, у тыя часы маленькі хлопчык, хрэснік графа, падабраў альбомы з фотаздымкамі. Гэты факт абнародаваў Алесь Матафонаў, аўтар вышэйзгаданага фільма.

Бенядзікт Ян Тышкевіч мог паехаць у Францыю, дзе жылі яго родныя, але чамусьці застаўся на радзіме. У трагічным апавяданні Алеся Кажадуба [4] адноўлена гісторыя кахання Б. Я. Тышкевіча і пакаёўкі, пані Канапацкай, з-за якой граф і адмовіўся пакідаць палац у Вялым, і далейшых яго пакут у зняволенні. Адпаведна мастацкаму аповеду, апошняга гаспадара палаца ў Вялым улады перадалі палякам, перад тым прымусілі падпісаць адмову ад усёй маёмасці: зямлі, замкаў, палацаў, дамоў, фабрык. Адзінае жаданне графа развітацца з пані Канапацкай задаволена не было. У хуткім часе граф памёр.

З прыведзеных звестак гістарычныя асобы паўстаюць як носьбіты культуры, ствараемыя ёю і яе стваральнікі. Атмасфера палаца ўплывае на характар яго жыхароў, якія не проста імкнуліся быць багатымі, але адукаванымі ў самым існым сэнсе гэтага слова.

Дзейнасная форма культуры выяўляецца ў разнастайнасці заняткаў прадстаўнікоў магнацкіх родаў, інтэнсіўнасці і накіраванасці творчага пачатку. Палац фарміруе іх маральнае аблічча, паўсядзённыя паводзіны, нормы і каштоўнасці, вобраз жыцця і менталітэт.

Прадметная форма культурнага існавання ахоплівае ўсё матэрыяльнае багацце палаца: творы мастацтва, звычаі і рытуалы, увасобленыя ў вобразе жыцця, свядомасці, інтарэсах, ідэалах, маральных нормах яго ўладальнікаў. Прастора палаца раскрывае каштоўнасна-нарматыўную сістэму магнацкай культуры.

Палац прымае сваё цэласнае і спецыфічнае аблічча дзякуючы пераўтварэнню духоўных якасцей яго жыхароў у прадметнае быццё

палацавага асяроддзя, якое, у сваю чаргу, пераймаецца новымі пакаленнямі яго насельнікаў.

Палац – захавальнік культуры, асветная прастора, разам з тым у прасторавым асяроддзі горада ці мястэчка – гэта месца, сэнс якога не абмяжоўваецца рамкамі мастацтва. Поліфункцыянальнасць палаца, носьбіта і транслятара культурнай інфармацыі, пашырае межы даследавання. У ім увасабляецца трохаспектная сістэма культуры: чалавечая, дзейнасная, прадметная, – і кожны з аспектаў вымагае асобнага вывучэння. Даследаванне спецыфікі семіятычнай прасторы палаца выяўляе перспектывы комплекснага асэнсавання культурнага кантэксту гісторыі пэўнага часу.


1. *Гловацкий, В.* Увлекательный мир парусов : Очерки по истории парусного спорта / В. Гловацкий ; пер. с пол. Л. Васильева, В. Кона. – М. : Прогресс, 1981. – 312 с.

2. Ежемесячные литературные приложения при журнале «Нива» на 1896 г. сентябрь – декабрь. – СПб. : изд-е А. Ф. Маркса, 1896. – 960 стб.

3. *Карпечэнко, Г. А.* Зборы старажытнасцей, рэчаў мастацтва і сямейныя архівы ў маёнтках Тышкевічаў XIX – першай палове XX ст. / Г. А. Карпечэнко. – URL: www.rusnauka.com/29DWS2012/Istoria/ 1120316. doc.htm.

4. *Кожедуб, Алесь.* «Золотая свинья» / Алесь Кожедуб // Уха в Пицунде / Алесь Кожедуб // Электронная библиотека RoyalLib.ru. – URL: http://royallib.ru/read/kogedub_ales/uha_v_pitsunde.html#61440.

5. *Кулагін, А. М.* Па колішніх маёнтках / А. М. Кулагін // Страчаная спадчына. – Менск, 1998. – URL: www.rusarch.ru/kulagin1.htm.

6. *Кунц, Д. Ф.* Драгоценные камни в мифах и легендах / Д. Ф. Кунц. – М. : Центрполиграф, 2008. – 287 с.

7. *Мешечко, Е. Н.* Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти : учеб. пособие / Е. Н. Мешечко ; Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. – Брест : БрГУ, 2011. – 296 с.

8. *Никифорова, Л. В.* Дворец в истории русской художественной культуры : автореф. дис. … д-ра культурологии: 24.00.01 / Л. В. Никифорова ; Рос. гос. пед. ун-т им. А. И. Герцена. – СПб., 2006. – 38 с.

9. *Сенкевичъ, Генрикъ.* Путевые очерки / Генрикъ Сенкевичъ ; пер. В. М. Лаврова. – М. : Типо-лит. Высоч. утв. Т-ва И. Н. Кушнеревъ и К°, 1894. – 440 с. – (Изд. ред. журн. «Русская мысль»).

10. *Тышкевич, Беата.* Не все на продажу. Воспоминания актрисы / Беата Тышкевич // Искусство кино. – 2007. – № 7, июль.

11. *Федорук, А.Т.* Старинные усадьбы Минского края / А. Т. Федорук. – Минск : Полифакт, 2000. – 416 с., ил. – (Сер. «Старинные усадьбы Беларуси»).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Янушкевіч, Язэп.* У прадчуванні знаходак. З адной вандроўкі ў архівы Варшавы, Вроцлава, Кракава / Язэп Янушкевіч. – Мінск : Полымя, 1994. – 96 с. – (Біб-ка часоп. «Маладосць»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ